*дурнога друга; Харош мой друг, ды дурань; Разумных дзесяці ворагаў не так бойся, як аднаго дурнога друга; З астрожнікам спазнайся – хутка да астрогу сам збірайся; Адзін другога даводзіць да ліхога* і інш. Тая ж парада тычыцца і кампаніі: *Ліхая кампанія на ліха выведзе; Ліхая кампанія і добрага папсуе; У кампаніі жыць – тужыць* і пад.

Згодна з народнай мудрасцю, самымі надзейнымі з’яўляюцца праверaныя часам сябры, якіх ведаем з дзяцінства або юнацтва: *Стары друг лепшы новых двух*; (як варыянт *Дарожшы адзін стары друг, як новых двух)*; *Новых сяброў набывай, але і старых не забывай*. Менавіта такі сябар адкрыта скажа праўду, нават калі і не вельмі прыемна яе чуць: *Не той сябра, хто губы медам мажа, а той, хто праўду ў вочы кажа* (як варыянт *Не той друг, хто медам мажа, а той, хто праўду кажа)*. І сам, як раіць народная мудрасць, будзь уважлівым у адносінах да сяброў і памятай: *Якую чашу другу наліў, такую самому піць*.

Такім чынам, разгледжаныя прыказкі не страчваюць сваёй актуальнасці. Яны выразна характарызуюць адметнасці светапогляду беларусаў, іх уяўленне пра сяброўскія ўзаемаадносіны.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Аксамітаў, А. Прыказкі і прымаўкі: Тлумач. слоўн. бел. прыказак і прымавак з арх., кафедр. збораў, рэд. выд. XIX і XX стст. / А. Аксамітаў. – 2-е выд., дапрац. – Мінск: Беларуская навука, 2002. – 320 с.
2. Крапіва, К. Беларускія прыказкі / К. Крапіва // Збор твораў у чатырох тамах.– Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР; Рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1963. – Т. 4 – 350 с.
3. Прыказкі і прымаўкі: у дзвюх кнігах / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1. – 560 с.; кн. 2. – 616 с.
4. Лепешаў, І. Я. Слоўнік беларускіх прыказак / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. – Мінск: Бел. асац. «Конкурс», 2006. – 544 с.
5. Носович, И. И. Сборник белорусских пословиц / И. И. Носович. – СПб, Типография Императорской Академии Наук, 1874. – 249 с.

УДК 821. 161.3

# БЕЛАРУСАМ ПРА БЕЛАРУСЬ. АСВЕТНІЦКА – ПАТРЫЯТЫЧНАЯ СКІРАВАНАСЦЬ НАРЫСА У. КАРАТКЕВІЧА «ЗЯМЛЯ ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ»

**Банцэвіч П. К.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Літаратура існуе для таго, каб узбагачаць і ачышчаць душы, выхоўваць пачуццё дасканаласці. Але яна не выключае і рацыянальна-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

ужытковых задач – даваць веды пра самае вялікае і дарагое. У нашай літаратуры – пра Беларусь і яе народ. У «Зямлі пад белымі крыламі» У. Караткевіч выходзіць за рамкі літаратуры. Ён гісторык і этнограф, мастацтвазнаўца і педагог, ідэолаг нацыянальнага адраджэння, які абвяшчаў: мой народ еўрапейскі, гераічны, духоўна багаты і высокакультурны. Нарыс У. Караткевіча з'яўляецца беларусазнаўчай працай, першай ў нашай літаратуры мастацкай гісторыяй культуры Беларусі. Гэта «своеасаблівая даніна любові аўтара да роднай зямлі, асвечаная арыгінальнай думкай і адметным поглядам мастака на працэсы гістарычнага развіцця беларусаў» [1]. Пісьменнік аналізуе гісторыю і сучаснасць, быт і фальклор, літаратуру і мову, жывапіс і архітэктуру, ментальнасць беларусаў, вядзе за сабой як вопытны экскурсавод, у папулярнай мастацкай форме падаючы найважнейшыя звесткі аб культуры свайго народа. У. Караткевіч не цураецца прапаведніцкай апеляцыі да чытача-суразмоўцы : «Ці думалі вы самі пра беларусаў не як пра сваіх бацькоў, братоў і сёстраў, сяброў або аднавяскоўцаў, а як увогуле пра людзей з асобным характарам, як пра народ з аднолькавай мовай, мінулым, сучасным і будучым? Ці задумваліся, які ён беларус?» [2].

У «Зямлі пад белымі крыламі» У. Караткевіч праводзіць інтэнсіўную навучальна-выхаваўчую работу, скіраваную на інтэлектуальна-духоўнае станаўленне чытачоў, прывівае любоў да ўсяго роднага: «Любіце гэтую сваю святую зямлю аддана і да канца. Іншай вам не дадзена» [2]. Выхаванне ідзе ў некалькіх напрамках: праз знаемства з гісторыяй свайго краю, праз эстэтычнае ўспрыманне прыгажосці роднай зямлі, праз вывучэнне маральна-этычных каштоўнасцей беларусаў. Пісьменнік адкрывае людзям Беларусь як скарб, кошт якому яны не ведаюць. Аўтар насычае твор дакладнымі фактамі, лічбамі, адзначаючы непаўторнасць кожнага кутка. Гэта цікавыя і рамантычныя Навагрудак з сусветна вядомымі гарадзішчамі і «курганам Міцкевіча», Нясвіж з палацамі Радзівілаў, Пінск з велічным сярэднявечным калегіўмам, Мазыр («міні-Кіеў»), Гальшаны, Мір. У. Караткевіч быў першым, хто пачаў пісаць пра беларускія палацы і замкі, храмы і маёнткі. Пра іх нельга было прачытаць у школьных падручніках, туды не вадзілі экскурсіі.

Даследаванне Беларусі вядзецца пісьменнікам ад прадгісторыі (міфы, язычніцтва, фальклор) да сучаснасці, ад першадзяржаўнасці – да савецкіх часоў. Тут адлюстроўваецца талент не літаратара, а навукоўца. Аўтар выказваецца аб багатых пісьмовых традыцыях беларускай мовы, аб пераемнасці ў развіцці старажытнай і новай беларускай літаратуры, уздымае праблемы этнагенезу беларусаў,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

распавядае пра помнікі прававой думкі – Статуты ВКЛ. Значная ўвага ўдзелена вялізным стратам, якія нёс беларускі народ ад крывавых войнаў і негатыўных русіфікатарскіх тэндэнцый палітыкі царызму.

У. Караткевіч знаёміць нас з славутымі асобамі, якія стаялі ля вытокаў беларускай духоўнасці, паказвалі прыклад служэння радзіме, народу: К. Тураўскі і М. Гусоўскі, П. Багрым і А. Міцкевіч, І. Буйніцкі і І. Грынявіцкі. Асабіста аўтар, адчуваючы такое магутнае духоўнае заплечча, узгадняў свае погляды з этычнымі і эстэтычнымі ідэаламі продкаў: «У. Караткевіч свядома арыентаваўся і на Скарыну, і на Каліноўскага, адчуваў падабенства сваёй і іх місій» [3].

Мастак шкадуе, што беларускіх асветнікаў не прызнавалі прарокамі на радзіме і асуджалі на доўгія блуканні па свеце: «Дзесяткі людзей нараджаліся і адыходзілі ў суседнія культуры, абагачаючы і часам узвялічваючы іх» [2]. І. Дамейка і Б. Вількіцкі, М. Судзілоўскі і К. Ельскі, М. Пржавальскі і Г. Апалінэр. Іх імёны уваходзяць у шматлікія энцыклапедыі і бібліяграфічныя даведнікі ўсяго свету, але яны невядомыя беларускай грамадскасці.

У. Караткевіч паказвае, што беларусы маюць багатыя набыткі на ўзроўні еўрапейскага культурнага развіцця: «Нам, беларусам, ёсць чым ганарыцца. Не менш, чым іншым» [2].

Сваім нарысам пісьменнік дае нам магчымасць адчуць сваю радзіму, адкрыць для сябе свой народ, імкнецца абудзіць у сучаснікаў цікавасць да вывучэння роднай гісторыі, мовы, культуры, сфарміраваць устойлівую патрэбу ў штодзённым развіцці нацыянальнай свядомасці і гістарычнага мыслення. У адным з інтэрв'ю мастак сказаў: «Выхоўваць любоў да нацыянальнай культуры можна адным толькі спосабам: выхаваннем у чалавеку гордасці за свой народ і яго дзеянні ў гісторыі. І сучасным – працай, часам непасільнай, па асвеце моладзі, па абуджэнні ў ёй глыбокіх ведаў аб сваіх людзях і сваім краі. Калі ўсе будуць працаваць над гэтым на грані сваіх магчымасцей – грамадства здолее ўсё» [4].

**ЛІТАРАТУРА**

1. Верабей, А. Абуджаная памяць: Нарыс жыцця і творчасці У. Караткевіча / А. Верабей. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 255 с.
2. Караткевіч, У. Збор твораў: У 8 т. – Т. 8. У 2 кн. Кн. 1. П'есы. Нарыс / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ.,1990. – 590 с.
3. Мальдзіс, А. Жыцце і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 229 с.
4. Русецкі, А. Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць: Нататкі літаратурнай творчасці / А. Русецкі. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 300 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ